**А. І. Бельскі**

Кафедра гісторыі беларускай літаратуры, філалагічны факультэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

УДК 821.161.3.09”20”-14

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІРЫКА КАХАННЯ: ТЭНДЭНЦЫІ ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

У артыкуле пазначаюцца традыцыйныя аспекты і новыя тэндэнцыі ў паэтычнай інтэрпрэтацыі пачуцця кахання, асэнсоўваюцца інтымныя матывы ў лірычнай творчасці, праявы жаночага светаадчування.

**Ключавыя словы:** лірыка кахання, жаночая паэзія, любоўныя пачуцці, рамантычнае, эстэтычнае, лірычная гераіня, вобраз.

**Узор цытавання:** *Бельскі А. І.* Беларуская лірыка кахання: тэндэнцыі пачатку XXI стагоддзя // София: электрон. науч.-просветит. журн. 2021. № 1. С. 28–33.

**A. Belsky**

Department of history of Belarusian literature, faculty of philology, Belarusian State University, Minsk, Belarus

# BELARUSIAN LOVE LYRICS: TRENDS OF THE BEGINNING OF THE XXI CENTURY



The article reveals traditional aspects and new tendencies of poetic comprehension of the feeling of love, comprehends intimate motives in lyrical creativity, manifestations of women’s worldview.

**Keywords:** love lyrics, women’s poetry, love feelings, romantic, aesthetic, lyrical heroine, image.

**For citation:** Belsky, A. (2021). Belarusian love lyrics: trends of the beginning of the XXI century. *Sophia*, 1, 28–33 (in Belar.).

**Аўтар:**
**Алесь Іванавіч Бельскі** – доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ.
*a_belsky@tut.by*

**Author:**
**Ales Belsky** – doctor of philological sciences, professor of the department of history of Belarusian literature, BSU.

«Пачынаецца ўсё з любві…» [23, с. 186], – так сказала вядомая паэтка. Слушнымі гэтыя словы будуць у першую чаргу да лірычнай творчасці, да паэзіі, дзе ці не самую галоўную ролю адыгрывае, паводле М. Бахціна, «лірычная самааб’ектывацыя – гэта апантанасць духам музыкі, насычанасць і прасякнутасць ім» [22, с. 231]. Амаль кожны паэтычны голас выяўляе хваляванне душы, асабліва тады, калі гаворыць лірычны герой, які кахае, ці лірычная гераіня, натхнёная палкім любоўным пачуццём. Духам музыкі, меладыйнасцю слова прасякнута беларуская лірыка кахання Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Канстанцыі Буйло, Уладзіміра Дубоўкі і многіх іншых песняроў гэтай вечнай лірычнай тэмы, пачынальнікаў нацыянальнага паэтычнага

мастацтва. «Я» паэта, які апявае каханне, гэта як бы і «я» кожнага з нас, на гэту асаблівасць духоўна-эстэтычнай камунікацыі з лірычным словам і голасам мастака звяртаў увагу М. Бахцін: «…вуснамі магчымай закаханай душы я апяваю сябе» [22, с. 231].

Увогуле кажучы, каханне – шматаспектны феномен: псіхалагічны, культурны, эстэтычны, філасофскі. Існуе фундаментальна-традыцыйнае разуменне гэтага вечнага пачуцця як духоўнай універсаліі і нязменнай чалавечай каштоўнасці. «Для носьбіта каханне выступае ў якасці максімальнай каштоўнасці і найважнейшай дэтэрмінанты жыццёвай стратэгіі… З усіх тыпалогій кахання, прапанаваных гісторыка-філасофскай і культурнай традыцыямі, найбольшую ролю ў развіцці еўрапейскай самасвядомасці адыграў дыхатамічны падзел кахання на зямное (грэшнае) і нябеснае (праведнае і святое)» [13, с. 86]. Выяўленне пачуцця кахання ў лірыцы многіх паэтаў глыбока інтымнае, максімальна даверлівае, нярэдка эратычна афарбаванае. Яно і рамантычна-ўзнёслае, духаўздымнае, і зямное, грахоўнае. Без кахання, здаецца, немагчыма ўявіць ні паэта, ні паэзію. Эрас – інстынкт і сіла жыцця, адзін з крэатыўных пачаткаў у мастацтве, і на гэту акалічнасць увага звярталася неаднойчы. Калі і казаць пра «эротыку тэксту» (Р. Барт) – гэта значыць пра эстэтычную асалоду ад чытання – то дзе, як не ў паэтычных строфах, радках яе адчуваць. Водар мілагучнага і вобразна-пачуццёвага слова стварае своеасаблівую аўру ў прасторы мастацкага тэксту, у паэтычным свеце прыгажосці і кахання.

Найбольшая колькасць твораў у беларускай паэзіі пачатку XXI ст. належыць лірыцы кахання. Гэты жанрава-тэматычны від творчасці даўні, з цягам часу набыў раўнапраўнасць, а сёння надзвычай распаўсюджаны ў паэтычна-мастацкай сферы. Яго запатрабаванасць і папулярнасць можна растлумачыць тым, што пасля эпохі савецкага афіцыёзу, панавання сацыяльнага, класавага, гучнай ідэалагічнай рыторыкі на змену ў літаратуры і мастацтве прыйшлі вечныя тэмы. Узнікла патрэба ў аднаўленні самакаштоўнасці асобы і выяўленні яе душэўна-чалавечай існасці. У гэтай сувязі З. Санюк, рэцэнзуючы зборнік паэзіі Т. Мушынскай «Сны кахання» (2006), адзначае заканамернасць вылучэння новай культурна-эстэтычнай дамінанты, духоўна-каштоўнаснай парадыгмы ў сучаснай беларускай паэзіі і з’яўлення чалавека іншага творчага тыпу: «Каханне становіцца вабнай мрояй, якая мае глыбокую ўнутраную сілу для быцця чалавека. У ідэальным вымярэнні каханне валодае каласальнай энергетыкай; яно змяняе, часам каардынальна, чалавека ў той ці іншы бок. І гэта самае вялікае пачуццё на зямлі, калі яно адухоўлена (не толькі існуе ў пачуццёва-плоцевых формах) і з’яўляецца сапраўднай, па-боскаму ўраўнаважанай сутнасцю. Гэта ўжо новая генерацыя „Чалавека, які Кахае, які мысліць Каханнем“» [16].

Лірычнае, інтымнае пачало прыкметна пераважаць у творчасці мастакоў слова, і найперш гэта тэндэнцыя выявілася ў паэзіі кахання. Сёння амаль у кожным нумары літаратурных часопісаў і абсалютнай большасці паэтычных зборнікаў змяшчаюцца любоўныя, інтымныя вершы. Багацце і разнастайнасць унутраных пачуццяў, думак, настрояў у лірыцы кахання складае цэлы матыўна-тэматычны комплекс. Каханне і ў паэзіі не ведае ўзроставых межаў ды бар’ераў. Сярод аўтараў, якіх усхвалявала і натхніла гэта сардэчнае пачуццё, пачаткоўцы і маладыя паэты, а таксама творцы паважнага веку: В. Івашын (зборнікі «З надзеяй і верай», «Прызванне»), А. Лойка (нізка «Позняе каханне»), Н. Гілевіч (зборнік «На флейце самоты») і інш. У адным з вершаў сучасны паэт прызнаецца: «У Краіну Кахання няўзнак заблукаю, // мінаючы межы слабое аховы» [5, с. 28] (А. Гібок-Гібкоўскі. «Краіна Кахання»). Нават сціслыя пералікі імёнаў

мастакоў лірычнага слова могуць красамоўна пасведчыць, што пачуццё кахання – галоўны эмацыянальна-духоўны і сэнсава-змястоўны цэнтр нацыянальнай паэзіі. Гэта адзін з самых важных бакоў сучаснай паэтычнай ментальнасці. Тэма і матывы кахання займаюць прыкметнае месца ў творчасці мужчын-паэтаў: Г. Бураўкіна, Р. Барадуліна, Ю. Голуба, К. Камейшы, М. Башлакова, А. Пісьмянкова, У. Марука, Л. Дранько-Майсюка, Г. Пашкова, Н. Гальпяровіча, Л. Пранчака, М. Шабовіча, Ф. Баторына, М. Пазнякова, К. Цыбульскага, Р. Сітніцы, В. Шніпа, А. Бадака, М. Касцюкевіча, І. Пракаповіча, М. Кандратава, Р. Малахоўскага, З. Арцюха, А. Спіцына і інш.

У святле гендарнага падыходу даследчыкі, маючы на ўвазе перш за ўсё інтымную і любоўную паэзію сучасных паэтак, выяўленне ў ёй пачуцця кахання, гавораць як пра факт існавання менавіта беларускай жаночай лірыкі (У. Гніламёдаў, А. Брадзіхіна, С. Калядка, Т. Фіцнер, І. Шматкова і інш.) [гл.: 3; 6; 11; 22]. Так, А. Брадзіхіна заўважае: «Аднак „жаночая“ паэзія тым і адрозніваецца ад „мужчынскай“, што ўнутраная прырода жанчыны праступае нават праз створаны суровы вобраз» [3, с. 93]. Паэт і крытык Л. Галубовіч мяркуе: «Р. Баравікова працягнула традыцыйную лірыка-рамантычную лінію нацыянальнай жаночай паэзіі» [4, с. 142]. Асноваўтваральны канцэпт і разнастайныя мастацкія мадэлі кахання знайшлі ўвасабленне ў творчасці згаданай Р. Баравіковай, а таксама шматлікіх іншых паэтак: З. Дудзюк, М. Баравік, С. Шах, В. Русілкі, І. Багдановіч, Л. Кебіч, Т. Трафімавай, Л. Раманавай, Н. Гарагляд, Н. Капа, С. Явар, Н. Кучмель, А. Петрушкевіч, Т. Барысюк, А. Ігнацюк, З. Падліпскай, І. Снарскай, Я. Дашынай, Л. Сом, А. Багамолавай, А. Спрынчан, Г. Дубянецкай, Т. Сівец, А. Данільчык, А. Гінько, В. Куставай, Я. Явіч, В. Трэнас, В. Гапеевай, Л. Шчэрбы, Т. Яцук, Н. Кудасавай, В. Морт, Т. Мацюхінай… Зразумела, тут пададзены далёка не поўныя пералікі паэтаў і паэтак, творы якіх маглі б паслужыць асновай, праграмай-праспектам для складання анталогіі ці зборніка сучаснай лірыкі кахання. Праўда, у выніку эстэтычнага адбору не ўсе вершаваныя тэксты ўзорныя, анталагічнага ці хрэстаматыйнага ўзроўню.

У паэзіі кахання можна вылучыць некалькі асноўных характэрных тэндэнцый. Найперш гэта рамантызацыя вобраза каханай і любоўных пачуццяў, узаемаадносін яго і яе. Ідэальны вобраз жанчыны стварыў М. Шабовіч: «Лясоўна, Фея, Чараўніца, // Пяшчоты сімвал дабраты, // Маіх начэй і дзён царыца, // Мой помнік сонца залаты!» [21, с. 53] («Ты ўжо даўно не чырванееш…»). Паэтычныя звароты і прачулыя інтанацыі раскрываюць замілаванае, пяшчотнае стаўленне да аб’екта захаплення: «Госця мая нябесная, // Госця мая зямная…» [20] («Госця мая нябесная…»). Свае санеты і песні кахання М. Шабовіч імкнецца ствараць у лепшых традыцыях любоўнай лірыкі: шчырага захаплення жаночай вабнасцю, узнёслай паэтызацыі, выяўлення далікатных і трапяткіх пачуццяў. Духоўную і эстэтычную каштоўнасць пачуцця кахання можна адчуць па вершах паэта «Ты для мяне – шчаслівых мар палёт…», «Сустрэчы нашы – як чароўны сон…», «Пакуль світае неба цішынёю…», «…І рукі дакраналіся да рук…», «Я дзякую табе, што ты прыйшла…», «Нам развітання хочацца пазбегнуць…» і інш.

Эстэтычнае дамінуе ў паказе інтымна-любоўных стасункаў Л. Сільновай. Вобраз каханага з яе твораў набывае рамантычнае ўспрыманне, ён прывабны сваёй загадкавасцю: «Цябе, о любы мой, кахаць – // Як кнігу дзіўную чытаць!..» [17, с. 32] («Кахаць»). Высокае і зямное яднаюцца ў вершах паэткі «Каханне, або Імгненны ўспамін», «Снежка кахання», «Слова „каханая“», «На нашым зялёным ложку…» і інш.

У лірыцы кахання з часоў антычнасці многае не мяняецца, яе паэтыка застаецца самай традыцыйнай, за мінулае стагоддзе яна зрабілася яшчэ больш эстэтычна вытанчанай і прыкметна інтэлектуалізавалася. Арыентацыя на каханне як ідэал красы – нязменная дамінанта: «Прыгожая жанчына… Божа, // навошта ты яе стварыў? // Каб зразумеў мужчына кожны, // дзеля чаго на свеце жыў» [1, с. 57] (Э. Акулін. «Прыгожая»). Героі паэтаў – «падданыя кахання», палоннікі красы, рыцары чароўнай панны, песняры серэнад і рамансаў. Сэнс быцця бачыцца ім у тым, каб кахаць, мроіць, чакаць каханую ці каханага, жыць светлымі згадкамі і салодкімі пакутамі. З сардэчнай напоўненасцю пачуцця гучаць песні кахання А. Камоцкага «Шукай мяне», «Я прысніў каралеву…», У. Мазго «Зорны дар», «Расстайнае сола жанчыны», Э. Акуліна «Нестае…», «Залатая мая», А. Бадака «Ты аддаляешся, ты аддаляешся…», «Можа быць, мы калісьці спаткаемся…», «Вочы мае – ночы твае…» і інш.

Нярэдка ў адлюстраванні пачуцця кахання і аб’екта героя спалучаюцца два планы: рэальны і фантазійны, які набывае прыкметы сімвалічнасці. Паэт Л. Дранько-Майсюк пасля «Вершаў для А.» стварыў яшчэ адзін таямнічы жаночы вобраз – спадарыні Эл. Аднак гэта не ідэальны вобраз прыўкраснай пані. Яго насцярожвае характар уладнай дзелавой жанчыны, якая любіць шыкоўнае і гламурнае жыццё. Гэты жаночы псіхатып у гістарычным аспекце нагадвае каралеву Бону. Разам з тым у «Кнізе для спадарыні Эл» (2012) Л. Дранько-Майсюк эстэтызуе пачуццё кахання як ідэал «высокай красы». Узнёслай музыкай кахання гучыць яго верш «Сон лілей». Л. Дранько-Майсюк сцвярджае пазітыўную дыялектыку міжчалавечых стасункаў, заснаваную на даверы, гармоніі, спрадвечным духоўным прыцягненні яго і яе: «Мужчына павінен ісці да жанчыны. // Жанчына павінна ісці да мужчыны. // І верыць павінен мужчына жанчыне. // І верыць павінна жанчына мужчыне» [8, с. 91] *(*«Ля ратушы – 1»).

Вобраз упэўненай, валявой жанчыны стварыла Л. Сом у кнізе вершаў «Каралева прыйдзе ноччу» (2007). На першы погляд, яе лірычная гераіня традыцыйная і досыць тыповая: яна спазнала радасць і асалоду кахання, разам з тым зведала і што такое расстанне, душэўныя пакуты. Жанчына імкнецца быць цвёрдай і рашучай, нават свабоднай, яна намагаецца мужна ўздымацца над рэальнымі абставінамі. Ды лірычная гераіня ў вобразе Каралевы, якой бы моцнай яна ні выдавала сябе, застаецца ўсё ж жанчынай: яна сумуе па мілым, зноў і зноў жыве «цёплай верай сваёй» у каханне: «І толькі калі пры стрэчы // Я дотык адчую твой, // На міг ці на гэты вечар // Я веру табе…» [19, с. 54] («О, як нясцерпна і прагна…»). У тым, каб жыць каханнем, праяўляецца не толькі істотная ментальная рыса жанчыны, але і яе глыбінная жаночая існасць.

Паэткі нярэдка апелююць да сусветнавядомых культурных вобразаў герояў і гераінь, пры гэтым звяртаюцца да прыёмаў тэатралізацыі, травестацыі. Апеляцыя да антычнасці з праекцыяй на навакольную рэчаіснасць выяўляецца ў вершы А. Ігнацюк «Лаўлю ў сабе Федру»: «Квет бэзу, пах ветру… // Лаўлю ў сабе Федру…» [10]. У такіх выпадках у светаадчуванні і самапазнанні праяўляецца штосьці архетыповае, нейкі важны спрадвечны пачатак (напрыклад, вечная жаноцкасць). Уласнае «я» прымерваецца да таго ці іншага жаночага вобраза ці атаясамліваецца з яго існасцю: «Я – Клеапатра. // І нецярпліва, і няўтольна // Я каханага чакаю. // І змейка тая, // Што чакае // Клеапатру, – // Таксама я» [14]. (Т. Мушынская. «Егіпет. Клеапатра»). Падобныя параўнанні і аналогіі тояць у сабе пэўную небяспеку, паколькі аўтар можа апынуцца «пад прыцэлам» парадыста. Тым не менш у сучаснай беларускай паэзіі назіраецца нязмушаная эстэтычная камунікацыя з жаночымі вобразамі-персанажамі мінулых эпох.

Настраёвыя модусы, інтымна-пачуццёвыя матывы ў сучаснай лірыцы кахання самыя разнастайныя. Ахапіць іх у сукупнасці проста немагчыма. Найбольш распаўсюджаныя ў лірычнай творчасці матывы прызнання ў каханні, радаснай паэтызацыі і ўслаўлення аб'екта кахання. З вуснаў паэтаў гучыць хваласпеў каханню, якое натхняе на вершы: «…Расцвіў мой закаханы верш. // Чатырохстопны мой каштан, // Табе прысвечаны адзінай…» [18] (Р. Сітніца. «На вуліцы, дзе ты жывеш…»). Досыць вялікая частка твораў на любоўную тэму – тужлівыя элегіі расстання, адзіноты і самоты. Вось як іх аўтары выяўляюць настраёвы лад свайго лірычнага пачуцця: «…гэты верш не пісаў, а плакаў, // без цябе…»; «Пра цябе мне і вецер шапоча, // і на снезе сініца піша, // і снягі маўчаць пра цябе» [15] (Ю. Пацюпа. «Сумны воран сядзіць, як вехаць…»); «Кахання мроі, рваныя на часткі, // Спакоем беласнежным замяло» [12] (Р. Малахоўскі. «Расстанне»). Галоўнае ў лірыцы такога кшталту – плынь унутраных пачуццяў і перажыванняў, такая вершатворчасць у асноўным бессюжэтная, трымаецца на раскрыцці ўласнага інтымнага свету.

Паказ стану закаханасці, інтэрпрэтацыя любоўных узаемінаў яго і яе ў вершаваных тэкстах аўтараў авангарднай плыні часам набываюць парадаксальнасць, нечаканыя асацыяцыі, падаюцца з аўтарскім гумарам і лёгкай іроніяй: «расстраляй мяне // сваім пяшчотным позіркам // я ведаю: у цябе атрымаецца // ты заўсёды рабіла гэта метка… // я пайду з радасцю // насустрач тваім стрэлам // а калі дайду // закрыю амбразуры тваіх вачэй // сваімі вуснамі…» [9, с. 98]. Гэта любоўная фантазія створана В. Жыбулем у вершы «Расстраляй мяне». Нягледзячы на пэўную тэатралізаваную дэманстратыўнасць, эпатажнасць падобных тэкстаў, у паэтычным свеце гэтага аўтара адчуваецца каштоўнасць і значнасць свету закаханых: «З табою // ўдваіх // нас болей, // чым *іх*» [9, с. 97] («З табою…»).

Сёння некаторыя паэты сярэдняга і маладзейшага пакаленняў больш адкрытыя і смелыя ў выяўленні сваёй інтымнасці, эратычных пачуццяў і пабуджэнняў. Часам у лірычнай творчасці аднаго і таго ж аўтара поруч з увасобленымі рамантычнымі мроямі прысутнічае любоўная жарсць, плоцевыя памкненні. Праз сто гадоў пасля М. Багдановіча, аўтара вершаванай нізкі «Эрас», падкрэслена эратычны характар паэтычнага мыслення стаў фактычна літаратурна-эстэтычнай нормай, а не чымсьці ганебным і табуяваным. «Выказваць сваё цела» імкнуцца не толькі мужчыны-паэты, але і маладыя жанчыны-паэткі. Інтымнае і эратызм набываюць у многіх выпадках эстэтычна-мастацкае ўвасабленне. Наогул, у сучаснай інтымнай лірыцы існуюць як бы два полюсы гэтага пачуцця, два яго бакі: прыгожае, чыстае і зямное, грахоўнае. Эратычныя матывы знайшлі выяўленне ў вершаваных тэкстах Ю. Пацюпы, І. Сідарука, Э. Акуліна, А. Хадановіча, А. Брусевіча, Л. Сом, В. Бурлак, В. Гапеевай, В. Морт, В. Куставай і інш. Гэтыя аўтары шчыра перадаюць любоўна-інтымныя пачуцці і жаданні, яны праз паказ глыбока асабістага, вельмі інтымнага і патаемнага раскрываюць эратычную сферу чалавека. На жаль, у паказе асобнымі паэтамі жарсці, пажадлівасці часам прысутнічае сексуальна грубаватае, празмерна натуралістычнае.

Такім чынам, беларуская лірыка пачатку XXI ст. на тэму кахання – з'ява шматгранная, дынамічная, яна развіваецца як у традыцыйна-класічным выглядзе ці варыянце, так і ў тых арыгінальных і па-свойму наватарскіх тэкстах, дзе ўвасабляюцца пэўныя мадэлі паводзін і ўзаемаадносін, рэпрэзентуецца адмысловае маўленне, новы (авангардны ці постмадэрнісцкі) суб'ектна-суб'ектны тып камунікацыі. Безумоўна, паэзія кахання існуе ў кантэксце найноўшага часу з яго зменай сацыякультурнай парадыгмы,

жыццёвых поглядаў, моладзевай свабоды і разняволенасці ў выяўленні эратычнага пачатку, сваёй сексуальнасці. Аднак нязменным у нацыянальнай лірыцы кахання застаецца арэол рамантычнасці, душэўна-пяшчотнае, тонкае выяўленне пачуццяў і перажыванняў чалавечага сэрца. Каханне, можна сказаць, суаўтар вершаванага радка, яно натхняе пісаць і ствараць, абуджае жаданне выказаць самае таемнае і запаветнае. Споведзі і лірычныя маналогі, песні і мелодыі кахання сучасных беларускіх аўтараў выяўляюць у чалавеку самае лепшае, прыгожае і цудоўнае, што сведчыць пра духоўнасць нашай нацыянальнай паэзіі, багацце і глыбіню яе эмацыянальна-пачуццёвага свету, арыентацыю на высокія маральна-эстэтычныя ідэалы.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Акулін, Э.* Малітва воч: вершы, пераклады / Э. Акулін. – Мінск: Медысонт, 2012. – 140 с.

2. *Бахтин, М. М.* Собрание сочинений: в 7 т. / М. М. Бахтин; Ин-т мировой лит. им. М. Горького РАН. – М.: Русские словари; Языки славянских культур, 2003. – Т. 1. – 957 с.

3. *Брадзіхіна, А. В.* Сучасная беларуская інтымная лірыка: тэндэнцыі і перспектывы развіцця: манагр. / А. В. Брадзіхіна. – Гомель: ГДУ, 2009. – 202 с.

4. *Галубовіч, Л.* Сыс і кулуары: літ.-крытыч. эсэ / Л. Галубовіч. – Мінск: Літ. і Мастацтва, 2010. – 176 с.

5. *Гібок-Гібкоўскі, А.* Насамрэч: кн. вершаў / А. Гібок-Гібкоўскі. – Мінск: Кнігазбор, 2007. – 96 с.

6. *Гніламёдаў, У.* Высокі сэнс быцця (пра «жаночую» паэзію) / У. Гніламёдаў // Гніламёдаў, У. Класікі і сучаснікі: артыкулы, нарысы, старонкі ўспамінаў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – С. 240–249.

7. Дзень паэзіі-2005 / склад. В. Шніп. – Мінск: Маст. літ., 2005. – 318 с.

8. *Дранько-Майсюк, Л.* Кніга для спадарыні Эл: проза, вершы, п’еса / Л. Дранько-Майсюк. – Мінск: Кнігазбор, 2012. – 200 с.

9. *Жыбуль, В.* Дыяфрагма: збор вершаў / В. Жыбуль. – Мінск: Логвінаў, 2003. – 112 с.

10. *Ігнацюк, А.* Лаўлю ў сабе Федру / А. Ігнацюк // Дзеяслоў. – 2004. – № 6. – С. 101.

11. *Калядка, С. У.* Беларуская сучасная жаночая паэзія: мастацкія канцэпцыі «жаночага шчасця» / С. У. Калядка. – Мінск: Беларус. навука, 2010. – 163 с.

12. *Малахоўскі, Р.* Расстанне / Р. Малахоўскі // Полымя. – 2012. – № 2. – С. 63.

13. *Можейко, М. А.* Любовь как феномен культуры: проблема эволюции западноевропейских интерпретаций / М. А. Можейко // Социология. – 2016. – № 3. – С. 85–92.

14. *Мушынская, Т.* Егіпет. Клеапатра / Т. Мушынская // Полымя. – 2008. – № 6. – С. 60.

15. *Пацюпа, Ю.* Сумны воран сядзіць, як вехаць… / Ю. Пацюпа // Дзеяслоў. – 2011. – № 3. – С. 131.

16. *Санюк, Д.* Чалавек, які кахае / Д. Санюк // Літаратура і мастацтва. – 2007. – 21 верас. – С. 7.

17. *Сільнова, Л.* Зачараваная краіна: вершы / Л. Сільнова. – Мінск: Лімарыус, 2007. – 160 с.

18. *Сітніца, Р.* На вуліцы, дзе ты жывеш… / Р. Сітніца // Полымя. – 2001. – № 6. – С. 71.

19. *Сом, Л.* Каралева прыйдзе ноччу: вершы пра каханне / Л. Сом. – Мінск: Логвінаў, 2007. – 88 с.

20. *Шабовіч, М.* Госця мая нябесная… / М. Шабовіч // Полымя. – 2010. – № 3. – С. 3.

21. *Шабовіч, М.* Мая надзея: вершы / М. Шабовіч. – Мінск: Маст. літ., 2006. – 174 с.

22. *Шматкова, І.* Наталіцца роднасці святлом…: агульнае і адметнае ў творчасці Е. Лось, Н. Мацяш, Г. Каржанеўскай / І. Шматкова. – Мінск: Ковчег, 2011. – 184 с.

23. *Янішчыц, Я.* Выбранае / Я. Янішчыц; уклад. А. Канапелькі і В. Коўтун. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 351 с.


*Артыкул паступіў у рэдкалегію 25.02.2021.*